УДК 821.161.3.09

# СІСТЭМА ЎМОЎНЫХ ВОБРАЗАЎ У ДРАМАТУРГІІ ІГАРА СІДАРУКА (на матэрыяле выбраных твораў)

**Караткевіч Вячаслаў Іванавіч**
старшы выкладчык кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый установы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова"
(г. Магілёў, Беларусь)

*Ключавыя словы: вобраз, драматургія, тэкст, семантыка, псіхалагічны тып.*

*У матэрыялах аналізуецца сістэма ўмоўных вобразаў такіх драматургічных твораў Ігара Сідарука, як "Крык" і "Галава" з пазіцый псіхалагічных установак і магчымых адхіленняў у псіхіцы адлюстраваных асоб.*

Беларуская драматургія канца XX – пачатку XXI ст. усё больш прыцягвае ўвагу не толькі беларускіх, але і замежных даследчыкаў [4]. Тым не менш, часцей праблема псіхалагічных установак тых або іншых вобразаў выпадае з полю зроку навукоўцаў.

У вобразнай сістэме беларускай драматургіі канца XX стагоддзя асобае месца займаюць персанажы, пазбаўленыя індывідуалізацыі, імя. Гэта вобразы з вялікай доляй умоўнасці, іх функцыя – зборнае ўвасабленне (маральнае ці сацыяльнае) сутнасці пэўнай сукупнасці грамадства (дэкласіраваныя асобы, эліта і інш.).

Найбольш яркімі прыкладамі такога роду ўмоўных вобразаў з'яўляюцца дзейныя асобы фарсаў Ігара Сідарука "Крык" (1995) і "Галава" (1997), якія былі створаны ў рэчышчы драмы абсурду. Дакладна вызначыць жанравую прыналежнасць названых твораў дастаткова праблематычна, бо "літаратурныя



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

жанры, асабліва на мяжы XX–XXI стст., маюць у сабе патэнцыяльную здольнасць да супраціўлення тым ці іншым класіфікацыям” [3, с. 5].

Мастацкая прастора “Крыку” – гэта палілогі трох персанажаў, два з якіх хаваюцца за маскамі: “Дрын, ён жа Дроб, ён жа Дрот. Абзеля, яна ж Ляскатунка, яна ж Гарбуха” [6, с. 39]. Яны, як і Шкрыбудаб, маюць умоўны характар, што дасягаецца праз стварэнне таксама ўмоўных і метафарычных прасторы і часу: “Электронны гадзіннік, які адлічвае час назад, чыгуначны семафор, чорна-белы шлагбаум. Падземныя люкі, птушынае пудзіла, дзіцячыя арэлі. Пралітае віно, бохан хлеба з усаджанаю сякераю. Час – няпэўны…” [6, с. 39], незвычайнай “фактурай” твора: рэплікі напісаны без пазначэння асоб, якія прамаўляюць гэтыя словы.

Дрын і Абзеля з’яўляюцца эматыўнымі асобамі, бо маюць праявы мяккасардэчнасці, яны радуюцца зносінам з прыродай. Пры гэтым эматыўнасць перакрыжоўваецца з дыстымічнасцю. Свядомасць Дрына і Абзелі апаноўваюць страшныя ўспаміны (у т.л. пра смерць дзяцей), гэтыя асобы не бачаць выйсця з зачараванага кола жыццёвых непрыемнасцяў. Урэшце, іх эмацыйны стан пачынае нагадваць субдэпрэсію. Нягледзячы на жаданне штосьці змяніць, Дрын і Абзеля застаюцца пасіўнымі назіральнікамі, бо разумеюць бессэнсоўнасць пошукаў і паразумення нават паміж самымі блізкімі: “– <…> Тады я зірнуў насупраць і здрыгануўся ад жаху: маёй Абзелі, маёй мілай чароўнай Абзелі болей не было! Побач сядзела нейкая Ляскатунка… // – Гэта была я. // – Ты?! // – Я. Я была з табою побач заўсёды. // – Мы абсалютна чужыя людзі! Як мы можам быць разам? // – Таму й разам, што чужыя” [6, с. 45–46].

Унутраныя праблемы Абзелі і Дрына выяўляюцца праз знешні выгляд (горб у жанчыны) ці праз праз метафарычны аповед мужчыны пра паездку ў цягніку і захапленне жанчынамі, якія там ехалі (увасабленне пошукаў сапраўднага шчасця і бессэнсоўна страчанага жыцця).

Зусім іншым выглядае Шкрыбудаб. Гэта цыклатымічная асоба, якая ўвесь час знаходзіцца ў стане прыўзнятага настрою, перманентнага жадання дзейнічаць, але пры гэтым можа быць жорсткай і абыякавай. Шкрыбудаб выконвае ў п’есе ролю саманазванага дэміўрга. У яго маўленні назіраецца жаданне “загаварыць” суразмоўцу, адцягнуць увагу, адвесці ў бок ад праблем, якія хвалююць Абзелю. У цэнтры павінны быць толькі ўласныя праблемы і жаданні, а не боль і перажыванні іншых, бо гэты “дэміўрг” мае дзве левыя нагі (алюзія на вядомы выраз ‘як захоча левая нага’). Да таго ж Шкрыбудаб – асоба эгаістычная, здольная прысвоіць сабе права распараджацца лёсам іншых асоб.

Адлюстраванне бессэнсоўнага існавання ў свеце – асноўны пасыл казачнага фарсу “Галава”. Тут таксама прадстаўлены ўмоўныя вобразы з



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рознымі псіхалагічнымі ўстаноўкамі. Да Шкрыбудаба ў "Крыку" набліжана Галава, якая ўвасабляе зменлівую "звышсілу", здольную падладкавацца пад абставіны або змяніць гэтыя абставіны пры неабходнасці. У творы паслядоўна прадстаўлены змены гіпаманіякальнай і меланхалічнай фаз цыклатымічнага развіцця асобы. Галава выходзіць за межы канкрэтнага тэксту і стварае своеасаблівую персонасферу (больш падрабязна пра гэта [1]).

Астатнія жыхары сметніка – маргінальныя асобы з ярка выражанымі дэпрэсіўнымі рысамі, што падкрэсліваецца іх перманентнай незадаволенасцю ўласным становішчам, зацыкленасцю на адной праблеме: Сіротка галадае і хварэе, Шукальнік шукае есці, апарат, Сіротку, Дурань з дзвярыма цягае дзверы і не дапускае магчымасці абысціся без іх, Бежанка занятая забеспячэннем дабрабыту, Шыбуршун цягае ўсё ў сваю нару. У нейкай ступені гэтыя вобразы набліжаюцца да сімулятыўных (больш падрабязна пра гэта [2]).

Разам яны выступаюць як сукупнасць адрынутых грамадствам лішніх людзей. Кожны з іх адчувае сваю непатрэбнасць і па-свойму супрацьстаіць эліце грамадства, якая ўвасоблена ў Галаве. Хворае грамадства нараджае хворых асоб.

Праз такую вобразную сістэму бытавыя праблемы набываюць характар быццйных, аўтар пашырае сэнсавую аб'ёмнасць свайго твора экстрапалюючы сметнік да мадэлі грамадства з яго дзівакамі, якія прымушаюць задумацца над сваім існаваннем, мяшчанамі, ныцікамі і маргіналамі.

Такім чынам, адзначанае вышэй дае нам падставы сцвярджаць наступнае. У драматургічных творах І. Сідарука ствараецца своеасаблівая вобразная сістэма, пабудаваная ў адпаведнасці з законамі драмы абсурду: дзейныя асобы набываюць умоўны характар. Яны падкрэслена тыпізаваны і нясуць у сабе адзнакі метафар. Умоўныя вобразы з'яўляюцца носьбітамі рознага роду псіхічных адхіленняў – своесаблівай абарончай рэакцыі на ціск грамадства. Драматург адлюстроўвае немагчымасць адэкватных рэакцый псіхікі на жыццёвую неўладкаванасць і бязладдзе. Умоўныя вобразы ўяўляюць сабой элементы адлюстравання свету, дзе дамінуе права сілы і голасу, дзе пачуцці і жаданні маленькага чалавека не прымаюцца пад увагу, не ўлічваюцца пры прыняцці рашэнняў. Месца гэтых маленькіх людзей – жыццёвы сметнік.

**Літаратура**

1. Караткевіч, В.І. Персонасфера драматургічных твораў Міколы Матукоўскага (на матэрыяле камедый "Мудрамер" і "Зомбі, альбо Мудрамер – два") / В.І. Караткевіч // Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі да 120-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы, г. Мінск, 3–4 сакавіка 2016 г. / рэдкал. А.А. Манкевіч [і інш.] ; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2016. – С. 326–329.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Караткевіч, В.І. Сімулятыўны вобраз-персанаж у беларускай постмадэрнісцкай драматургіі канца XX стагоддзя / В.І. Караткевіч // Компаративні дослідження слов’янських мов і літератур : пам’яті академіка Леоніда Булаховського : збірник наукових праць. – Київ : Освіта України, 2016. – Вип. 29. – С. 177–184.
3. Макарэвіч, А.М. Літаратурныя жанры і іх мадыфікацыі : тэарэтычны аспект / А.М. Макарэвіч // У ракурсе сучаснага асэнсавання : міжкафедральны зборнік навуковых прац / рэд. У.С. Дзянісаў. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2004. – Вып. 2 : Філалогія. – С. 5–13.
4. Макарэвіч, А. Сучасная беларускамоўная драматургія ў польскіх літаратуразнаўчых даследаваннях / А. Макарэвіч // «Зъ зычливости ку моеи отчизне»: tom pamiątkowy dedykowany Profesorowi Mikołajowi Timoszukowi / red. nauk. N. Barszczewska, M. Chaustowicz. – Warszawa : [s. n.], 2017. – С. 233–244.
5. Сідарук, І. Галава / І. Сідарук // Сучасная беларуская п’еса / склад. П.В. Васючэнка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1995. – С. 221–247.
6. Сідарук, І. Крык / І. Сідарук // Крыніца. – 1995. – № 4. – С. 39–49.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова